

Жыве Беларусь!

Народная газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№223 (736) 16 лістапада 1993 г. Аўторак. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 500400 экз. Кошт у розніцу — 25 руб.

ФАКС

Калинковичи — за "Народную газету"!

Калинковичский районный узел связи подвел предварительные итоги подписки на периодические издания, которые будут выходить в первом квартале будущего года.

Они свидетельствуют, что наибольшей популярностью среди республиканских газет у калинковичан пользуется "Народная газета": ее выписано уже 3 554 экземпляра, на втором месте — областная газета "Гомельская праўда".

Но есть газеты, авторитет которых среди подписчиков падает: в первую очередь это касается московских "Известий" и "Правды": последнюю выписали всего 56 человек.

Виктор САКОВИЧ.

Беларусь укрепляет границы

Литовские газеты сообщили, что в Поставах в Витебской области создаются два подразделения пограничной службы для укрепления границы с Литвой и Латвией.

На военных базах, что остаются после вывода из Беларуси российских войск, создаются отдельная авиационная эскадрилья и госпиталь пограничных войск. В составе новых подразделений будет 337 военных и 245 гражданских служащих и рабочих.

Андрей КОРСАК.

Деньги взять не удалось

Конфузом для истца закончилась тяжба между председателем Шумилинского райпотребсоюза В.Косинским и журналистом Э.Доморацким, который раскритиковал в печати работу местной потребительской кооперации и ее начальника.

Районный и областной суды установили полную справедливость публикации и отказали инициатору процесса в денежном возмещении морального ущерба. Примечательно, что госпошлину за возбуждение судебного дела В.Косинский заплатил не из своего кармана, а из кассы потребсоюза.

Сергей ДВИНСКИЙ.

Гутен таг, дети!

Не игрушки и шоколадки, а учебники на немецком языке привезли "шефы" из германского города-побратима Нинбурга в детский сад Витебского станкостроительного завода имени Кирова.

Тем не менее несъедобные подарки пришлись по вкусу малышам и их воспитательницам, окончившим институт иностранных языков. С их помощью и с "благословения" родителей дети уже несколько месяцев изучают немецкий по программе 5-го класса средней школы.

Сергей ДВИНСКИЙ.

Диалог состоялся

Могилевский филиал совместного белорусско-российско-американского предприятия "Диалог" подписал соглашение с одним из крупнейших израильских банков "Банкаполим" на получение от последнего кредитов на создание совместных предприятий по производству медикаментов, а также продуктов питания, в том числе для детей.

Как сообщил генеральный директор предприятия "Диалог-Могилев" Григорий Лишанский, кредиты можно получить уже в самое ближайшее время при предоставлении проекта, гарантирующего использование средств по назначению.

Николай КОМЛЕВ.

Вкратце

Постановлением Совета Министров Беларуси Петр Чаус освобожден от должности заместителя министра обороны и назначен начальником Военной академии Вооруженных Сил республики.

❑

19 ноября в Минске состоится очередной, уже 9-й по счету семинар повышения квалификации бухгалтерских работников.

Его участники ознакомятся с последними изменениями и дополнениями в вопросах налогообложения и отчетности, смогут приобрести комплекты методических указаний и инструкций по рассмотренным вопросам.

❑

Вице-министр иностранных дел Литвы А.Янушко заявил, что его страна не согласна получать от Германии компенсацию жертвам фашизма, если посредником будет Россия.

Литва могла бы регулировать вопрос компенсации двусторонним путем.

❑

В воскресенье вечером в Таллинне, недалеко от центра города, в непосредственной близости от Кадриоргского отделения полиции произошел мощный взрыв бомбы.

Взрывом повреждено 3 полицейских автомобиля, ранен 1 работник полиции.

❑

Один человек задохнулся в дыму во время пожара в здании Конституционного суда вчера утром.

Он был одним из "группы специалистов какой-то организации, которые хотели познакомиться с устройством часов" на угловой башне здания суда. Причины пожара пока неизвестны.

❑

Руководитель Грузии Эдуард Шеварднадзе заявил, что "ни один грузин не примирится с потерей Абхазии, и она обязательно будет возвращена".

❑

Курс доллара на торгах Московской межбанковской валютной биржи в понедельник вырос по сравнению с торгами в минувшую пятницу на 5 рублей и составил 1185 рублей за доллар.

Швондерам прибавится работы?

По распоряжению мэра Ю.Лужкова со вчерашнего дня в столице России введен режим особого пребывания гостей из ближнего зарубежья и стран СНГ.

Теперь каждый, кто намерен задержаться здесь на срок более суток, обязан не только получить разрешение — отметку в паспорте территориального отделения милиции, но и уплатить 10% от минимальной зарплаты, установленной в России, что составляет свыше 800 российских рублей. Например, за 10 дней пребывания надо уплатить 8—12 тысяч. А за уклонение от регистрации неминуем штраф в размере 15—40 тысяч рублей. Если нарушитель попался вторично, ему придется "отстегнуть" до полумиллиона рублей (50 минимальных окладов).

Положением документа о визовом режиме предусмотрено принудительное выдворение непрошеных гостей за их же счет.

Леонид ФАДЕЕВ.

Пешком дешевле и надежнее

Минский горисполком принял решение о новых тарифах на проезд в городском пассажирском транспорте с 20 ноября.

Так, стоимость одной поездки на всех видах транспорта составит 50 рублей, а на автобусе-экспрессе — вдвое дороже. Месячный билет на один вид обойдется пассажиру в 3 500 (автобус-экспресс — 5 000), комбинированный — 4 500, а за единый проездной на все виды необходимо будет уплатить 6 000 рублей.

❑

Несмотря на повышение цен на услуги общественного транспорта с 20 ноября, работники транспортной отрасли рискуют не получить зарплату за ноябрь: расходы на топливо слишком велики. Объединение "Минскпассажиравтотранс" в день расходует на горючее 150 миллионов рублей.

МЕНЯЮ
КУПЛЮ
ПРОДАМ
УЙДУ В ОТСТАВКУ

Рисунок Олега ПОПОВА.

Спорт-экспресс

В полуфинальном турнире Кубка Европы, который проходил в Финляндии, хоккеисты минского "Тивали" обыграли в минувшую пятницу со счетом 6:0 чемпиона Словении — команду "Акрони" (Есеница). В субботу был повержен норвежский чемпион — "Валеренген" — 6:3. И, наконец, в воскресенье в Турку минчане сыграли вничью — 2:2 с командой Владимира Юрзинова — местным ТПС. Поскольку финны победили своих соперников с более крупным счетом (соответственно 11:2 и 11:1), они заняли первое место в группе и вышли в финал. Нашим же за такую путевку придется заочно посоперничать с обладателями вторых мест в остальных трех полуфинальных группах.

❑

Минчанка Наталья Зверева выбыла из борьбы в четвертьфинале крупного теннисного турнира серии "Вирджиния слимз" в Филадельфии с призовым фондом 750 тысяч долларов. Она проиграла испанке Кончице Мартинес в двух сетах — 4:6, 4:6.

Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Белинформ, БелаПАН и РИД.

Гостиная "Народной газеты"

Леонид РАДКЕВИЧ: "Как местную власть ни называй, главное — она должна помогать людям жить и работать..."

Л. И. Радкевич — председатель Фрунзенского райсовета столицы. Должность значительная. В районе десятки крупнейших предприятий, проживает 340 тысяч человек. А вот кабинетик маленький, да еще приемной с секретаршей нет. Люди сюда попадают прямо из коридора. За год председатель принял более тысячи посетителей. Когда работать?



—Леонид Иванович, не секрет, что наша экономика разваливается на глазах. Об этом уже слышать надоело. Но вот, говорят, что в вашем районе ситуация, если не блестящая, то, во всяком случае, не такая трагическая, как в других местах. У вас что — оазис какой-то экономический?

—Не оазис, конечно, но цифры говорят сами за себя. Последние два года держимся на плаву, а кое-где и приращиваем. Например, в прошлом году в сопоставимых ценах объем производства в промышленности района возрос на 10 процентов. А за девять месяцев этого года при всеобщем развале мы дали одиннадцать процентов прироста. При массовых увольнениях в других местах даже создаем дополнительные рабочие места.

Кроме того, удачно решаем вопросы конверсии.

Например, такого объединения, как НПО "Гранат". Здесь при всех трудностях начат выпуск бытовых стиральных машин и другого оборудования. В этом году предусматривается произвести около пяти тысяч машин. Это современные полуавтоматы, которые будут продаваться достаточно дешево.

Или другой пример. Есть у нас завод отопительного оборудования. Там создали с американцами совместное предприятие и успешно выпускают промышленное оборудование, которое работает, так скажем, по принципу газовой колонки. Оно позволяет избежать строительства теплосетей, с которыми у нас, как вы знаете, огромная проблема. Оборудование в основном поставляется в Америку, где, в отличие от нас, умеют ценить экономию энергии.

— Прирост производства продукции дал государственный сектор экономики?

— Не только. Мы развиваем и негосударственные формы собственности. Достаточно сказать, что около 30 процентов доходов в районный бюджет поступило именно отсюда. Сегодня у нас восемь тысяч налогоплательщиков, из них половина — физические лица. Благодаря тому, что появляется много предпринимателей, финансовое положение района достаточно благополучное. Успешно финансируются многие программы: народного образования, медицины, проводится работа по реальной защите малоимущих. Недавно открылся центр милосердия, где ветераны могут купить себе самое необходимое.

По улице Притыцкого ввели в строй, не побоюсь это сказать, лучший универсам в Минске. Здесь около 50 детей, не имеющих родителей, обслуживаются по льготным ценам. В ресторане рядом будут организованы бесплатные обеды для малоимущих.

— Как-то странно это звучит на фоне хора жалоб и стенаний...

— Ничего странного нет. Даже при наших часто нелепых и ограниченных законах и на уровне райсовета можно создавать для предпринимательства режим наибольшего благоприятствования. Конечно, по отношению к другим регионам. Вот конкретный пример. Из двадцати пяти белорусских банков двенадцать находятся на территории нашего района или имеют филиалы. Случайно это? Думаю, нет. Любой предприниматель или фирма у нас может зарегистрироваться и начать свое дело всего за дватри дня за небольшую дополнительную плату

Существует система доверительных отношений между руководителями и предпринимателями разных уровней и органом власти. Уже года четыре действует Совет директоров, что позволяет приходить друг другу на помощь. Он собирается раз в квартал и решает конкретные вопросы. Впрочем, есть у наших руководителей и идеи макроэкономического уровня. Мы ищем их решения на уровне государства. А экспериментируем на своем районном уровне.

При райисполкоме работает Совет предпринимателей, в который входят самые цивилизованные представители нарождающегося слоя.

— Вы, наверное, были первыми — я имею в виду Фрунзенский район столицы, — кто начинал проводить различные аукционы. Тогда, да и сейчас многие смотрели на это с подозрительностью. Не растранжиривается ли народное достояние?

— Я года полтора убеждал городское начальство в том, что нужно взимать плату за право поставить киоск. Мне возражали: мол, земля не продается. А ведь мы и не продаем ее. Провели аукцион, народ стал торговаться за право торговать в данном месте. Цена еще в начале года в некоторых людных точках доходила до трех миллионов рублей. Кому от этого плохо?

Ведь эти деньги идут в наш районный бюджет. И используются для нужд наших людей. В прошлом году, например, мы заасфальтировали дорог в шесть раз больше, чем в более благополучном девяностом.

Впрочем, в последнее время нас успешно отучают от всех этих аукционов. После каждого прибывает такое количество проверяющих, что поневоле чувствуешь себя если не преступником, то очень неуютно. Вроде на словах мы к рынку стремимся, а на деле...

— Не мешает ли действующее законодательство в вашей работе?

— В экономике мы, учитывая существующее законодательство или отсутствие его, пытаемся делать невозможное. И это удается, когда власть стимулирует инициативу и поиск каждого. Считаю, что это главная функция власти.

— Как руководитель района вы удовлетворены нашей системой местной власти?

— Этот вопрос мне можно задать как депутату Верховного Совета. А как руководитель районного масштаба скажу откровенно: мне все равно, как будет называться орган — Совет или как-то по-другому. Важно, чтобы власть была властью, а не сторонним наблюдателем или, что еще хуже, ареной для выяснений политических и других отношений.

У нас года два как существуют 18 комитетов общественного самоуправления, сейчас они уже получили законодательный статус. Мы опираемся на них.

— Выходит так, что руководитель Фрунзенского района делом доказывает, что и в этих условиях можно работать. Невольно возникает вопрос: в наших бедах не столько условия виноваты, сколько люди?

— Не хочу, чтобы поняли, будто я занимаюсь саморекламой. Но знаю одно: в наш переходный период важно полностью использовать как объективные, так и субъективные факторы.

Мы сейчас ударились в другую крайность: полностью предоставили хозяйственных и других руководителей самим себе. Позвони ближе к концу рабочего дня по телефону, мало кого найдешь. У каждого гаражик, дачка, а то и коттедж. Мы забыли, когда собирали людей.

У меня вот на столе лежит "простыня" — тут показатели всех предприятий района. Я знаю, чем они живут сегодня, а главное — что их ждет завтра. На основании этого делаю анализ и ищу оптимальное решение. Для этого я тут и сижу... Называйте это как хотите — экономикой или политикой, но важен результат.

— Такие "простыни" раньше лежали на столе у каждого первого секретаря...

— А в этом нет ничего плохого. Мы должны контролировать ситуацию и предусматривать возникновение узких мест, а не сваливать все на неразбериху и рынок. Например, в конце августа в Минске не было газа. Стояли многие предприятия. А наши работали. Мы смогли найти даже этому противоядие.

Сегодня готовы загрузить все простаивающие мощности.

— Как?

— Вариантов много. Например, сейчас в США демонтируются два автомобильных завода. Куда их привезти и поставить? Вы скажете, это не обязанность предрайсовета. Но поймите, что сейчас нужно заниматься и этим. Такая ситуация. Власть должна помогать производителю любыми доступными и недоступными способами. И власть, даже районная, имеет для этого огромные возможности. К сожалению, далеко не всегда и везде они используются.

Считаю, что прежде всего мы должны сделать нашу республику известной во всем мире. К сожалению, пока до этого далеко.

Недавно побывал в составе делегации под руководством С.Шушкевича в Америке. Там практически ни в одном банке не знают, что такое Беларусь. Не слышали фамилий ее лидеров. Уверен, что с огромным миром американского бизнеса должны поближе познакомиться и другие руководители. И должны искать в этом мире интерес для нашей республики.

А пока с этим плохо.

Знаете, какие мысли пришли в голову, когда побывали в нашем посольстве в Вашингтоне? Оно расположено между посольствами Никарагуа и какой-то африканской страны. Вот наше, образно выражаясь, сейчас политическое и экономическое место...

— Вы принимали активное участие в создании белорусско-американского СП на базе НПО "Центр". Тогда и сейчас у этой идеи много противников, главный аргумент которых — мы распродаем Родину...

— Американцы правильно говорят: пускай у вас будет самая передовая идея, но вы ее не реализуете. Ведь нужно еще иметь для организации современного производства современное оборудование, комплектующие, знать рынки сбыта. Это совсем не просто. Ведь любая самая ценная идея составляет только пятую часть будущего успеха. Остальное зависит от других факторов. И если эти факторы будут не американскими, так японскими, или южнокорейскими, или китайскими. Так работают во всем мире...

— Американцы нам, может быть, в чем-то помогут, но не спасут. Можем ли мы сами себя спасти и что для этого нужно?

— Прежде всего снизить налоговый пресс. Вспомним такую же ситуацию в Америке, когда была проведена реформа Рузвельта. Он пошел на создание огромного внутреннего долга. Чтобы запустить производство, и прежде всего строительную индустрию. Ни у кого не было денег, и вдруг все начали строить жилье. Появилась работа. Начали получать люди доходы. Значит, стали покупать... И таким образом завертелся весь экономический механизм.

К слову, у меня каждый год замы представляют записки о возможных путях зарабатывания средств в местный бюджет.

Потом — нужно пустить к нам иностранный капитал, а не отделываться бесконечными разговорами. Но он не пойдет без гарантий. Лучше всего это решить в свободных экономических зонах.

И, конечно, нужно изучать чужой опыт. У нас есть сегодня несколько опорных точек. Например, побратимский район в Шанхае. В Голландии нам делают специальную программу перехода района к рынку. Теперь Америка...

— Извините, но не могу не задать такой вопрос. Вы были в свое время первым секретарем райкома компартии. Как сейчас относитесь к этой строчке в своей биографии?

— Партия была организмом, встроенным в наше государство. Так было и от этого никуда не денешься. Эту партию нужно было трансформировать. Но случился ее крах...

Раньше я был инженером. Хорошим инженером. Построил не один завод в республике и за ее пределами. Общественной и партийной работой, мягко говоря, не увлекался. А если честно, просто не любил. Но так случилось, что попал в райкомовское кресло. И здесь занимался прежде всего экономикой...

И теперь большой политикой не занимаюсь и не хочу заниматься. Важнее всего сейчас экономика. Тем не менее кое-кто в парламенте считает меня "красным" депутатом.

Но у каждого свой взгляд. Я скажу честно, переживаю за распад Союза. Думаю, что это была ошибка. Нам не хватило лет пяти, чтобы здесь, в Беларуси, была достаточно стабильная ситуация с энергообеспечением, переработкой сельхозпродукции. И тогда более-менее нормально могли бы переходить к рынку...

Возвращаясь к сегодняшнему дню, скажу, что хватит делить друг друга на правых и левых, и видеть смысл своей жизни в том, чтобы покрепче ущипнуть один другого. Ведь нам жить здесь вместе. Поэтому нужно прежде всего всем думать, как сообща выживать. А подумав хорошенько, действовать. Что мы и делаем...

Интервью брал Владимир САМОЙЛОВ.

Позиция

"Авторов" экономического кризиса — к ответу, считают депутаты Новополоцкого горсовета

Недавно они обсудили социально-экономическую обстановку и пришли к неутешительным выводам. Поспешное введение расчетных билетов Национального банка, полагают депутаты, стимулировало вымывание рублей из денежного оборота республики. Допущены другие крупные промахи в финансовой политике. В результате с точностью до "наоборот" были реализованы намерения, декларированные руководителями стран СНГ, о проведении согласованной кредитно-денежной политики.

Существенным недостатком экономической политики, проводимой правительством, было и значительное отставание в преобразовании промышленных предприятий на условиях акционирования с уменьшением доли государственного капитала.

Городской Совет с горечью отметил, что остались во многом без ответов его обращения в Верховный Совет, Совет Министров и лично к Председателю Совмина по вопросу развития Новополоцкого промышленного узла.

Анализ показывает, что обострение экономической ситуации вызвано не столько объективными условиями, сколько непоследовательными и неадекватными действиями органов государственного управления.

Горсовет считает необходимым, чтобы Верховный Совет дал принципиальную оценку действиям должностных лиц и органов госуправления, не обеспечивших реализацию соглашений, предусмотренных в рамках договоренностей по СНГ, а также не обеспечивших подготовку народного хозяйства к работе в зимних условиях и заготовку сельхозпродукции.

Владимир БОРИСОВ.

Дыскусійная трыбуна

Крызіс... Гэта слова зараз можна прыстасаваць да любой сферы нашага жыцця. Крызіс эканомікі прыводзіць да крызісу ўлады, крызіс палітычны — да прававога нігілізму, а ўсё гэта ўвогуле адбіваецца на нашай духоўнасці, на нашым дабрабыце. Ці можам мы вырвацца з гэтага замкнутага кола, ці ёсць тыя сілы і ідэалы, якія змаглі б павесці нас за сабой? Сённяшнія публікацыі пад рубрыкай "Дыскусійная трыбуна" — гэта скрыжаванне розных поглядаў на нашу рэчаіснасць. Будзем спадзявацца, што плюралізм думак, палемічны падыход да актуальных праблем дня прынясуць, у рэшце рэшт, станоўчы вынік.

Палітыка супраць эканомікі,

альбо На чым трымаюцца ланцугі беларускай залежнасці

Агульнавядома, што ў цывілізаваных краінах палітыкі ў першую чаргу кіруюцца эканамічнымі інтарэсамі сваёй дзяржавы. Гэта — вядучая аксіёма палітычнай практыкі, і калі нехта з кіраўнікоў забывае пра згаданы аспект, то на яго палітычнай кар'еры можна смела ставіць крыж. Але пры адной прынцыповай умове — у краіне павінна існаваць развітая дэмакратычная сістэма выбараў, праз якую грамадзяне маюць магчымасць уплываць на ўладу ў адпаведнасці з іх асабістымі эканамічнымі інтарэсамі. Гэта — другая аксіёма палітычнага ладу дэмакратычных дзяржаў, якая ў сукупнасці з першай дазваляе стабілізаваць грамадскую згоду паміж палітыкамі і насельніцтвам.

Калі ж зірнуць на нашу рэспубліку, гісторыю яе пакуль што нядоўгага суверэнітэту, то мы павінны прызнацца самім сабе, што пераважная большасць нашых грамадзян мае вельмі цьмянае ўяўленне аб сваіх дэмакратычных правах і, больш таго, не бачыць тых рэальных палітычных сіл, якія змаглі б прапанаваць і ажыццявіць прывабныя для ўсіх эканамічныя пераўтварэнні. Адсюль пасіўнасць мас у палітыцы, якую асобныя даследчыкі-сацыёлагі выдаюць за нейкую асаблівую талерантнасць беларусаў.

Не трэба таксама забываць і пра тую вялікую шкоду, якую нанеслі светапогляду людзей няўдалыя рэформы апошніх гадоў. Прычым не толькі тым, што жыццёвы ўзровень большасці насельніцтва значна панізіўся, а ў першую чаргу за кошт спосабу іх правядзення. Дэмакраты новай плыні, асабліва ў Расіі, — у нас яны ніколі не мелі ўлады — засталіся бальшавікамі па сваёй псіхалогіі, і іхняя практыка рэформ заснавана на сілавых метадах, калі нават самыя карэнныя пераўтварэнні прымаюцца не толькі простай большасцю галасоў невядома кім абранага органа ўлады, а, наогул, указам аднаго чалавека. Прычым самі гэтыя рашэнні часам значна адрозніваюцца ад папярэдніх абяцанняў. З'яўляецца глеба для палітычнай барацьбы за ўладу за кошт папулісцкіх лозунгаў і самых неверагодных праграм.

Не апошнюю ролю ў барацьбе палітыкаў займае і спадчына сацыялізму ў краінах былога Саюза. Перш-наперш гэта глыбокія карані псіхалогіі ураўнілаўкі ў размеркаванні, заснаванай на добраахвотна-прымусовай працы на дзяржаўных прадпрыемствах. Прызнаемся шчыра: працаваць без асаблівага напружання і атрымліваць прыблізна роўную заработную плату было вельмі зручна для значнай часткі нашых суграмадзян. І з'яўленне прадпрымальнікаў, якія здольны зарабляць непараўнальна больш, для многіх як чырвоная ануча для бугая. Асабліва калі ўлічыць, што шмат сённяшніх буйных капіталаў сапраўды не вельмі чыстага паходжання. Апошняе становіцца вельмі зручнай падставай для палітычных спекуляцый з боку паслядоўнікаў камуністычнай ідэі, якая, аддадзім належнае, мае пэўныя гістарычныя карані не толькі ў нас.

Тут самае месца зрабіць невялікае адступленне. Як вядома, сама камуністычная ідэалогія ўзнікла і сфарміравалася як палітыка-эканамічная тэорыя ў перыяд станаўлення так званага капіталізму свабоднай канкурэнцыі, калі эксплуатацыя наёмнага работніка сапраўды была жахлівай. На падставе аналізу выступленняў пралетарыяту супраць сваіх работадаўцаў класікі марксізму прыйшлі да думкі аб ролі класавай барацьбы як рухаючай сілы развіцця грамадства. І як сапраўды геніяльныя людзі зрабілі не менш геніяльную памылку — аб магчымасці і непазбежнасці перамогі ў гэтай барацьбе рабочага класа.

Між тым уся папярэдняя гісторыя чалавецтва сведчыла аб іншым: класавая барацьба нідзе і ніколі не прыводзіла да перамогі аднаго з бакоў на больш-менш значны час. Успомнім, напрыклад, гісторыю паўстанняў рабаўладальніцкай эпохі ці сялянскіх войнаў перыяду феадалізму. Урэшце сама магчымасць перамогі менш адукаванага класа нясе ў сабе пагрозу грамадскага рэгрэсу. Класікі марксізму павінны былі заўважыць, што барацьба класаў праз пэўны час прыводзіць да з'яўлення новых сацыяльных груп у грамадстве і пераходу апошняга ў новую якасць. Таму іх вывад аб непазбежнасці дыктатуры пралетарыяту быў гістарычнай памылкай, якая, на жаль, ажыццявілася менавіта ў нас. І гэта, бадай, быў адзін з найбольш цяжкіх удараў палітыкі па эканоміцы.

Галоўным наступствам гэтай гістарычнай памылкі з'явілася ліквідацыя прыватнай уласнасці і фарміраванне спецыфічнага слоя насельніцтва, які ўзяў на сябе ці лепш сказаць — захапіў кіраванне дзяржаўнай эканомікай. Маецца на ўвазе так званая наменклатура, звязаная не эканамічнымі інтарэсамі асобных гаспадарак, а сваім агульным каставым інтарэсам. Прычым іх прыналежнасць да камуністычнай партыі была толькі знешнім атрыбутам, сутнасць — у праве распараджацца дзяржаўнай маёмасцю дзеля асабістага дабрабыту. У залежнасці, вядома, ад пэўнай ступені іерархічнай лесвіцы. Сама па сабе камуністычная ідэя іх цікавіла менш за ўсё, і яны маглі з такім жа поспехам аб'яднацца на любой іншай платформе. Дарэчы, менавіта па гэтай прычыне камуністычная партыя як палітычная ўлада рухнула амаль імгненна без колькі-небудзь сур'ёзнага супраціўлення. Таму і змагацца з камуністычнымі плынямі, як да гэтага заклікаюць некаторыя дэмакратычныя рухі, — марная трата часу і энергіі.

Яшчэ адно невялікае адступленне. Для дэмакратычнага грамадства наогул небяспеку прадстаўляюць не ідэі, а спосаб іх ажыццяўлення. Калі пад ідэю альбо тэорыю ствараецца партыя ці рух з жорсткай унутранай дысцыплінай, з напаўваеннай формай кіравання, то менавіта такая арганізацыя незалежна ад палітычнай афарбоўкі становіцца патэнцыяльна небяспечнай для дэмакратыі. Часцей за ўсё гэта характэрна для плыняў, якія не маюць шырокай сацыяльнай базы ці не ў ладах з прававымі высновамі грамадства. У дваццатым стагоддзі да іх ліку можна аднесці партыі і арганізацыі камуністычнага, нацыянал-сацыялістычнага і нацыянал-клерыкальнага накірункаў. І практычна выключаюцца названыя прыкметы ў адносінах да ліберальных і сацыял-дэмакратычных плыняў, паколькі апошнія заснаваны на першынстве асабістых правоў чалавека і не прыдатны для стварэння арганізацый з жорсткай дысцыплінай.

Разуменне гэтай прынцыповай рознасці ў палітычных рухах з'яўляецца вырашальным у асэнсаванні магчымых эканамічных рэформ у залежнасці ад таго, прадстаўнікі якіх палітычных сіл стаяць на чале дзяржавы.

Наша беларуская наменклатура з камуністычным радаводам, застаўшыся без цэментуючай партыі, зараз ліхаманкава спрабуе ўтварыць уласную палітычную арганізацыю, каб забяспечыць абарону сваіх інтарэсаў у будучых легітымных органах улады. Няцяжка здагадацца, што захаванне дзяржаўнай уласнасці на сродкі вытворчасці будзе адной з іх галоўных праграмных мэт. Нават калі дзеля перамогі давядзецца крыху адпусціць прэс дзяржаўнага ціску на эканоміку і прымірыцца з тым, што найбольш абачлівая частка наменклатуры разумее хімерычнасць гэтых намаганняў і спакваля займаецца ціхай прыватызацыяй.

З другога боку, рэфарматары дэмакратычнага крыла павінны добра разумець, што іх намаганні па разбурэнню наменклатурных бастыёнаў застануцца дарэмнымі без з'яўлення шырокага слою прыватных уласнікаў, так званага сярэдняга класа, які не толькі мае ўласныя сродкі існавання і не залежыць ад дзяржчыноўніка, але і асэнсоўвае свае палітычныя інтарэсы. Трэба таксама вельмі асцярожна адносіцца да хуткага падзелу грамадства на багатых і бедных. Гэта можа справакаваць узнікненне ультрарадыкальных груповак накшталт "чырвоных брыгад" у Італіі, што ў нашых умовах можа выклікаць патрабаванне "цвёрдай рукі". На жаль, самы час прызнацца, што спроба зрабіць хуткі пераход да рыначнай эканомікі па замежных рэцэптах пацярпела яўны правал.

Адной з прычын гэтага з'яўляецца сур'ёзная памылка каманды Я. Гайдара, якая паспрабавала прымяніць манетарныя догмы ў нярыначнай эканоміцы пры адначасовым разбурэнні агульнай эканамічнай прасторы. Спецыялістам у вобласці макраэканомікі добра вядома, што адна з галоўных догмаў манетарызму — стабільнасць грашовага абарачэння. Пры яе адсутнасці астатнія параметры зыходнай формулы манетарнай тэорыі — маса грошай, цэны і аб'ём вытворчасці — становяцца фактычна некіруемымі. Без канкурэнцыі і пры квазіманапалізме дзяржаўных структур лібералізацыя цэн у рамках манетарных падыходаў расійскага ўрада вылілася ў магутную гіперінфляцыйную хвалю і падзенне вытворчасці нават самых неабходных спажывецкіх тавараў. Гэта дало падставу беларускаму кіраўніцтву фактычна замарозіць рыначныя рэформы, што ў сваю чаргу замарудзіла кволыя спробы стварэння жыццяздольнай нацыянальнай эканомікі і паставіла яе ў поўную залежнасць ад палітыкі Расіі.

Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што Беларусь, як, бадай, і Украіна, знаходзіцца ў самых неспрыяльных умовах для ўмацавання свайго эканамічнага суверэнітэту. Справа ў тым, што менавіта гэтыя рэспублікі былі перанасычаны ў свой час прадпрыемствамі ваенна-прамысловага комплексу, рэзкае скарачэнне заказаў на прадукцыю якіх вельмі адчувальна і звязана з захаваннем рабочых месц для соцен тысяч людзей. Больш таго, некалі гэта стымулявала бурны рост буйных гарадоў, якія з'яўляюцца зараз асноўнымі спажыўцамі прывазных энергетычных рэсурсаў і атручваюць навакольнае асяроддзе. У краінах Балтыі, напрыклад, ступень уплыву прыведзенага фактару непараўнальна меншая. Тым самым можна зноў-такі канстатаваць, што палітычныя разлікі былых кіраўнікоў рэспублікі зрабілі вельмі дрэнную паслугу для сучаснай эканомікі.

Сёння Рэспубліка Беларусь апынулася на раздарожжы, з якога вельмі цяжка выбраць прыстойны для яе насельніцтва шлях. Дарадчыкаў, скажам шчыра, хапае, асабліва замежных. І не толькі з дальняга, як цяпер кажуць, а нават і з бліжняга замежжа. У НДЭІ Дзяржэканамплана, напрыклад, надзвычайную актыўнасць праяўляе група расійскіх эканамістаў на чале з Ф. Клацвогам, якім чамусьці не хапіла месца ў Маскве. Ці, можа, нашаму ўраду прыйшоўся даспадобы іх "навуковы падыход", у адпаведнасці з якім Беларусь лічыцца адной з шасці зон былога Саюза і яе будучыня разглядаецца выключна як элемент нейкага абстрактнага аб'яднання з адзіным каардынацыйным цэнтрам. Аргументы на карысць такога падыходу сыплюцца як з меха. Тут і традыцыйная блізкасць славянскіх народаў, і шматгадовая інтэграцыя эканомік, і залежнасць ад усходняга рынку і г. д. Здзіўляе другое: чаму не заўважаюць, што ўсё тое ж можна і трэба рабіць так, як гэта прынята паміж цывілізаванымі краінамі? І гандляваць, і ствараць сумесныя прадпрыемствы, і дазволіць бязвізавы праезд для грамадзян на падставе двухбаковых пагадненняў. Мець пры гэтым сваю нацыянальную валюту і з яе дапамогай праводзіць самастойную эканамічную палітыку ў інтарэсах Беларусі.

Здаецца, што нашы эканамічныя стратэгі, захапіўшыся ідэяй аднаўлення былых гаспадарчых сувязей у рамках новага эканамічнага саюзу, забываюцца пра галоўнае: нельга аднавіць тое, што адмоўлена самім жыццём. Былы Саюз разваліўся ў першую чаргу па прычыне яго эканамічнай неэфектыўнасці, і рыначныя пераўтварэнні прад'яўляюць новыя патрабаванні да гаспадарчых сувязей. На змену планавым пастаўкам ідзе купля-продаж сыравіны і тавараў самастойнымі прадпрымальнікамі.

Ні палітычны, ні эканамічны цэнтры ім не патрэбны. Затое не хапае больш ці менш уніфікаваных правілаў рыначных адносін і падтрымкі ў перабудове структуры эканомікі і перапрафіляванні прадпрыемстваў на выпуск канкурэнтаздольнай прадукцыі. Што нам перашкаджае? Няздольнасць старой наменклатуры? Дык няхай саступіць месца тым, хто здольны прапанаваць новыя падыходы. Ці, можа, на гэта не згодны народ, як любяць паўтараць некаторыя нашы кіраўнікі? Дык давайце спытаем яго і правядзём новыя выбары ці хоць бы рэферэндум. Колькі можна спасылацца на Расію, на яе жаданне альбо нежаданне нам дапамагчы? Можа, ужо пара і сваім розумам жыць?

Валеры ДАШКЕВІЧ,
кандыдат эканамічных навук.

Трэцяя сіла: міф ці рэальнасць?

Ідэя пра неабходнасць трэцяй сілы на Беларусі даўно лунае ў паветры. Яшчэ ў дзевяностым годзе, калі рыхтавалася праграма Сялянскай партыі, была распрацавана філасофія цэнтрызму. Сутнасць яе — палітыка здаровага сэнсу, адмаўленне крайніх праяў нацыяналізму і шавінізму, кансалідацыя грамадства. Сяляне заўсёды падсвядома прыхільнікі такой філасофіі.

У той час на тэрыторыі СССР адбывалася жорсткае супрацьстаянне паміж камуністамі і народнымі франтамі. У асобных рэгіёнах пралілася кроў. Каб пазбегнуць гэтага на шматпакутнай зямлі Беларусі, мы і хацелі на грунце цэнтрызму ўтварыць трэцюю сілу — Сялянскую партыю.

Камуністы ўспрынялі новую ідэю ў штыкі — гэта падрывала іх манаполію на ўладу. Была прынята пастанова бюро ЦК КПБ, дзе ставілася задача не дапусціць утварэння Сялянскай партыі. Рэзалюцыя Малафеева на дакуменце, які мы атрымалі з архіва КПБ: "т.Камаю, т.Тихине, т.Лингу. Создать группу и направить на съезд Крестьянской партии с целью сорвать его работу".

Нічога ў іх не атрымалася. Сялянская партыя была ўтворана, але яна адразу не стала ўплывовай трэцяй сілай на Беларусі. Грамадства ў той час не даспела да ўспрыняцця гэтай ідэі.

Другую спробу зрабіў нябожчык Міхась Ткачоў, вядомы гісторык і краязнаўца, лідэр Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады. На пачатку дзевяноста другога года ён прапанаваў утварыць трэцюю сілу шляхам аб'яднання палітычных партый, рухаў, грамадскіх арганізацый і прыватных асоб, якія выступаюць за цывілізаваны пераход ад таталітарнай сістэмы да прававой дэмакратычнай дзяржавы. Аб'яднанне назвалі "Новая Беларусь". Зноў пэўныя сілы пачалі разбуральную работу, і паступова ідэя была закансервавана.

Вясной дзевяноста другога года была ўтворана Партыя народнай згоды. Ядром яе стала група народных дэпутатаў, якія яшчэ да путчу ўтварылі ў Вярхоўным Савеце фракцыю "Камуністы Беларусі за дэмакратыю". Сама назва партыі, асноўныя праграмныя прынцыпы яе сведчаць пра жаданне стаць асновай трэцяй сілы на Беларусі.

А што думаюць шырокія народныя масы пра трэцюю сілу? Апошнія апытанні паказалі, што шэсцьдзесят сем працэнтаў грамадзян яшчэ не зрабілі свайго выбару, не падтрымліваюць ніякія палітычныя партыі. Думаецца, справа не толькі ў тым, што ў нас нізкая палітычная культура, што людзі страцілі веру ў сваю здольнасць уплываць на палітыку і палітыкаў. Проста ў іх няма выбару. Да гэтага часу ўжо вызначыліся прыхільнікі камуністаў і БНФ. Але большасць не прываблівае ні кансерватызм ПКБ, ні радыкалізм БНФ. Калі б сёння былі выбары, то вялікая колькасць выбаршчыкаў наогул не пайшлі б на выбарчыя ўчасткі. Трэба падкрэсліць, што камуністы ў такіх выпадках фальсіфікуюць выбары, галасуюць самі за тых, хто не прыйшоў, і такім чынам праводзяць сваіх людзей у органы ўлады.

Вось мы і прыйшлі да высновы, што грамадству Беларусі для правядзення эканамічных рэформаў і выхаду з крызісу неабходна новая палітычная сіла. Яна нарэшце ўтворана. Гэта шырокае аб'яднанне дэмакратычных сіл Беларусі "Вясна-94".

У пагадненні пра ўтварэнне аб'яднання даволі яскрава сфармулявана мэта: стварыць палітычныя ўмовы для цывілізаванага пераходу ад таталітарнай сістэмы да прававой дэмакратычнай дзяржавы. Акрэслены асноўныя прынцыпы аб'яднання "Вясна-94". Вось яны:

— будаўніцтва суверэннай дзяржавы, бяз'ядзерны статус і неўваходжанне Беларусі ў ваенныя блокі;

— прыярытэт правоў грамадзян, замацаваных ва ўсеагульнай дэкларацыі, перад інтарэсамі дзяржавы, нацыянальных і сацыяльных груп;

— рэфармаванне каманднай эканомікі ў сацыяльную рыначную.

Галоўная мэта і асноўныя прынцыпы аб'яднання сфармуляваны так, што кожны сумленны чалавек падтрымае іх. На самай справе, хто выступіць супраць правоў чалавека, рыначнай эканомікі, суверэннай дзяржаўнасці? Іх прадэкларавалі нават самыя кансерватыўныя сілы. Усё гэта ўжо ўвайшло ў дзесятак афіцыйных дакументаў, замацавана сотнямі подпісаў прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь.

Дзве бліжэйшыя задачы ставіць перад сабой аб'яднанне "Вясна-94": стварыць кааліцыйны ўрад народнага даверу дзеля ажыццяўлення эканамічных рэформаў, правесці выбары ў Вярхоўны Савет не пазней вясны 1994 года на аснове новага дэмакратычнага закона. Лічу, гэтыя задачы сталі сімвалам перамен для ўсяго беларускага грамадства.

Аб'яднанне "Вясна-94" дае магчымасць шырока ўдзельнічаць у грамадскім жыцці прыватным асобам. Менталітэт нашых людзей зараз такі, што слова "партыя" выклікае насцярогу і недавер. А для некаторых увогуле галоўны прынцып жыцця — не ўступаць ні ў якія партыі. Такая рэальнасць.

Але ж людзі маюць свае думкі, погляды. Уступіўшы ў грамадзянскія камітэты "Вясны-94", яны змогуць выказаць свой погляд, абараніць свае жыццёвыя прынцыпы.

Колькі слоў аб праблеме лідэра. Даўно вядома, палітычныя партыі ўтвараюцца ці пад вядомага лідэра, ці пад прывабную ідэю. Напрыклад, пры стварэнні Сялянскай партыі была ідэя: зямлі патрэбен гаспадар. Адсюль і патрабаванне зямельнай рэформы. Нашы апаненты, не маючы аргументаў супраць гэтай ідэі, вешаюць нам ярлык разбуральнікаў калгасаў. На самай справе разбураюць іх некаторыя кіраўнікі калгасаў і іх бліжэйшае акружэнне шляхам раскрадання калгаснай маёмасці. Мы выступаем за іх рэфармаванне. А першы крок рэформы — выбары старшынь калгасаў на агульных сходах тайным галасаваннем. Тайным.

Другія апаненты, жадаючы звузіць сацыяльную базу Сялянскай партыі, называюць яе партыяй толькі сельскіх жыхароў. Гэта не адпавядае рэчаіснасці! Усе мы выхадцы з вёскі, усе мы звязаны з зямлёй. Толькі мінчане ў 1993 годзе падалі 183 тысячы заяў на атрыманне зямельных участкаў для будаўніцтва жылых дамоў, садаводства і агародніцтва. Фактычна выдзелена крыху больш дзесяці працэнтаў. У райцэнтрах і гарадскіх пасёлках пры зямлі кожны другі. Такім чынам, у правядзенні зямельнай рэформы зацікаўлены ўсе: вёска, пасёлак, горад.

Ідэя зямельнай рэформы добра працуе на аўтарытэт Сялянскай партыі. Партыя расце, ствараюцца новыя арганізацыі, павялічваецца яе ўплыў на грамадства і без папулярнага лідэра. На добрай ідэі з цягам часу вырастуць лідэры.

Пагадненне і заяву аб'яднання "Вясна-94" падпісалі 3 палітычныя партыі, 18 грамадскіх, прафесійных, рэлігійных арганізацый і творчых саюзаў, звыш 50 вядомых людзей Беларусі. Працэс далучэння да аб'яднання працягваецца. Вельмі важна, што "Вясну-94" падтрымала інтэлігенцыя. Амаль усе кіраўнікі творчых саюзаў паставілі подпісы пад заявай.

Разумеем, яшчэ зарана гаварыць, што "Вясна-94" стала ўплывовай сілай на Беларусі. Наперадзе вялікая праца: распрацоўка эканамічнай праграмы рэформаў, фарміраванне ценявога ўрада, утварэнне грамадскіх камітэтаў "Вясны-94" у раёнах, вёсках, працоўных калектывах. Усё гэта можна і трэба зрабіць за асенне-зімовы перыяд.

У заключэнне хацеў бы выказаць адну простую ісціну. Ніхто для нас лепшага жыцця не зробіць. Трэба брацца за справу самому. І першая задача — змена ўлады. Паверце, урад Кебіча — гэта наша нацыянальная трагедыя. Усё ж рабілася на вашых вачах: то ўводзілі купоны, то іх адмянялі, то ўводзілі мытні, то іх адмянялі, то забаранялі камерцыйным структурам завозіць паліва, то дазвалялі. Няма вызначанай палітыкі. Прыйдзе час, падлічаць страты, якія прынёс народу ўрад. Яны будуць не меншыя, чым ад чарнобыльскай катастрофы. Але ў адзіночку змяніць цяперашнюю ўладу ніхто не зможа. Трэба арганізаваная сіла. Такой сілай і выступае шырокае аб'яднанне дэмакратычных сіл Беларусі "Вясна-94".

Яўген ЛУГІН,
старшыня Беларускай сялянскай партыі.

Дзве афіцыйныя мовы ў дзяржаве — бы дзве гаспадыні ў хаце...

Мікола ТРАФІМЧУК

Той, хто так ці інакш ставіць пытанне аб дзвюх дзяржаўных мовах у адзінай дзяржаве Беларусь, той — хоча ён таго ці не — спрыяе расколу грамадства і самой дзяржавы.

Хто-хто, а беларусы пакутамі на крыжы заслужылі перад Богам права на сваю ўласную дзяржаву. Але нячысцік ізноў сваімі хітрыкамі спрабуе ўзяць рэванш. Цешцеся, маўляў, сваёй кволай дзяржаўнасцю, а я нараблю вам спадцішка такога, што ажно самому вусцішна стане: узаконю ў вашай дзяржаве дзве афіцыйныя мовы. І лухта ўсё гэта, што двух'языкіх істот у прыродзе не бывае...

Зрэшты, двух'языкасцю многіх з нас ужо й не напалохаць. Па волі д'ябла ці па сваёй нядобрай волі дзесяткі і сотні тысяч беларусаў дзекаюць і цекаюць па-руску. Крыўдна і брыдка падчас слухаць такое "двухмоўе". Вось ён, слёзны вынік сатанінскага эксперыменту па зліццю моў і культур!..

Вядома, ніхто не супраць мовы братняга рускага народа. І калі ставіцца пытанне аб яе вывучэнні, добрым валоданні і ўжыванні пры міжнародных кантактах, мы толькі вітаем такую з'яву. Мне, напрыклад, адно няўцям: чаму некаторых маіх суайчыннікаў не задавальняе статус рускай мовы як міжнароднай? Гэта ж ганарова! Не, насуперак элементарнай логіцы яны крычаць пра неабходнасць надання мове суседняй, хай і дружалюбнай дзяржавы, статусу дзяржаўнай. Ды як, як яна можа быць дзяржаўнай у Беларусі, калі ўжо дзяржаўная ў Расіі? А куды падзець сваю?!

Не, шаноўнае спадарства! Сёння ў гэтым сэнсе нас можа непакоіць толькі адно: як падняць з бруду ўтаптаную самімі ж родную мову? Тыя, хто ў такі час клапоціцца пра іншую мову, аўтаматычна робіцца варожым і мове, і свайму народу, і сваёй дзяржаве. Карацей: хто супраць адзінай мовы, той супраць адзінай дзяржавы. Гэта ясна, як белы дзень!

А яшчэ я разумею так: ёсць у хаце адна гаспадыня, свая, родная, руплівая, рахманая. Навошта яшчэ адна, прычым з чужой, суседняй хаты, ды яшчэ калі і там няўпраўка? Як кажуць, даруйце, няма дурных!..

Безумоўна, у прыхільнікаў "дзвюх гаспадынь" ёсць некалькі аргументаў на сваю карысць. Гэта спасылкі быццам бы на адзіны гістарычны лёс беларускага і рускага народаў, на своеасаблівы менталітэт беларусаў, нарэшце — на рускамоўную савецкую школу выхавання не аднаго пакалення тутэйшага насельніцтва. Пра ўсё гэта можна яшчэ паспрачацца. Але й толькі! Не адным з гэтых аргументаў нельга апраўдаць гістарычную несправядлівасць, калі ў беларускай дзяржаве дух будзе чужы, не беларускі.

Але самае крыўднае і дзіўнае, што ў якасці аргументаў на карысць так званага двухмоўя даводзіцца чуць звычайную лухту. Маўляў, паглядзіце, якія дзяржаўныя мовы ў паднёваамерыканскіх краінах. Альбо: у ЗША дзяржаўная мова англійская, дык чаму ў Беларусі не можа быць руская? І яшчэ. У Швейцарыі, маўляў, дзяржаўныя мовы ажно тры... Выходзіць, што калі ў Швейцарыі ажно тры дзяржаўныя мовы, чаму ў Беларусі не можа быць толькі дзве?..

Ці патрэбныя тут контраргументы? Вядома, не. Маральна здароваму чалавеку ўсё зразумела. Але ў тым і бяда, што многія хворыя ўжо і не спрабуюць выздаравець...

Беларусь — як мае быць засведчана ў яе Канстытуцыі — унітарная, а значыць, монанацыянальная дзяржава. Карэнным народам са значнай перавагай з'яўляюцца беларусы. Значыць, афіцыйнай (дзяржаўнай) мовай можа быць толькі беларуская. А нацыянальныя меншасці хай на здароўе шануюць свае звычкі і мовы, што і павінна абараняць тая ж Канстытуцыя, а калі ёсць неабходнасць — і спецыяльны закон.

Центризм — путь к истинной демократии

